# Іван Апанасавіч ЛІТВІНОЎСКІ

# Ivan Apanasavich LITVINOUSKI



Дацэнт кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта БДУ Іван Апанасавіч Літвіноўскі – адзін з тых, хто сваёй шматгадовай і руплівай працай на ніве педагогікі і навукі ў поўнай меры ўвасабляе прызначэнне і сутнасць прафесіі выкладчыка ўніверсітэта. Больш за тое, ён з'яўляецца прыкладам шчырай адданасці сваёй *alma mater* за атрыманую ў яе сценах вышэйшую адукацыю і магчымасць прайсці шлях кандыдата навук і дацэнта, выдатнага знаўцы гісторыі спачатку ўсёй вялікай савецкай краіны, а потым, разам з калегамі па кафедры, сканцэнтравацца менавіта на гісторыі Расіі і Украіны. І ва ўсіх абставінах працы, ва ўзаемаадносінах з калегамі і студэнтамі дацэнт І. А. Літвіноўскі быў і застаецца ўзорам прафесійнасці, такту, прыроднай інтэлігентнасці, адказнасці за максімальна эфектыўнае выкананне справы.

Іван Апанасавіч з'явіўся на свет далёка ад Мінска – у с. Слабада Бурынскага раёна Сумскай вобласці Украінскай ССР. Нарадзіўся 15 ліпеня ў страшны 1942 г., калі родныя мясціны знаходзіліся пад фашысцкай акупацыяй. Яго бацькі, украінскія сяляне Апанас Цярэнцьевіч і Праскоўя Максімаўна, да вайны працавалі ў калгасе «Червоний Донбас». Бацьку паспелі прызваць у Чырвоную армію, і ён да 1944 г. ваяваў, а пасля цяжкага ранення вярнуўся да сям'і і хутка памёр. Маці давялося адной падымаць дзяцей на ногі, надрываючы жылы за працадні на калгасных палетках. Сын Іван з маленства спазнаў цяжкі сялянскі хлеб, але ўсяляк намагаўся атрымаць прыстойную адукацыю. Ён выдатна закончыў Першамайскую сярэднюю школу ў Сумскай вобласці, у 1957 г. уступіў у камсамол, але спачатку не мог вызначыць далейшы кірунак рэалізацыі сваіх інтэлектуальных задаткаў. Прыйшлося нават амаль год пасля школы папрацаваць слесарам на цукровым заводзе, які знаходзіўся ў родным сяле.

Нейкім чынам прыйшло азарэнне: «Хачу быць гісторыкам!» Вось толькі рэалізаваць намер юнак адважыўся далёка ад родных мясцін. Спакусіла тое, што ў Мінску Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у 1960 г. прапанаваў абітурыентам новую і па тагачасных мерках унікальную кваліфікацыю – быў адкрыты прыём на спецыяльнасць «Гісторыя» з магчымасцю яе выкладання на замежнай мове. Подых адлігі і такім чынам адбіўся на дзейнасці БДУ. Смелая і апантаная моладзь з розных куткоў усяго Савецкага Саюза не баялася ехаць на іспыты ў Мінск, не звяртаючы ўвагі нават на велізарны конкурс. І адным з тых шчаслівчыкаў, хто змог вытрымаць конкурс і стаць студэнтам гістарычнага факультэта БДУ, стаў Іван Літвіноўскі.

Пяць гадоў вучобы праляцелі хутка, і ўжо з верасня 1965 г. малады спецыяліст па размеркаванні стаў выкладаць у сярэдняй школе № 3 г. Маладзечна. Яго кваліфікацыя, пазначаная ў атрыманым дыпломе, і сёння гучыць унушальна: «Гісторык. Настаўнік гісторыі сярэдняй школы з выкладаннем на замежнай мове». Але першы педагагічны вопыт хутка абарвала павестка з ваенкамата. Для выпускніка БДУ ваенная служба была нядоўгай – са студзеня па лістапад 1966 г. З 1967 г. пасля дэмабілізацыі Іван Апанасавіч стаў працаваць рэферэнтам Мінскай гарадской арганізацыі таварыства «Веды», потым – метадыстам Беларускага рэспубліканскага Савета прафсаюзаў, дзе ён адказваў за арганізацыю культурна-масавай работы і нават нейкі час за мастацкую самадзейнасць у створаным рэспубліканскім прафсаюзным цэнтры – адмысловым доме. Зразумела, што такі напрамак рэалізацыі атрыманай ва ўніверсітэце падрыхтоўкі ніяк не мог задаволіць маладога спецыяліста. Хацелася прадоўжыць вывучэнне гісторыі ўжо на навуковым узроўні.

Таму натуральным стаў крок паступлення ў аспірантуру роднага факультэта БДУ ў 1968 г. Іван Апанасавіч пісаў дысертацыю на кафедры гісторыі СССР. Тэмай была абрана праблема ажыццяўлення электрыфікацыі ў Беларусі ў міжваенны перыяд. Канечне, для назвы на той час у абавязковым парадку патрэбна было дадаць, што гэта важная справа ажыццяўлялася як увасабленне «ленінскіх ідэй». Галоўнае ж тое, што малады вучоны ўпершыню ў Беларусі паслядоўна прасачыў увесь шлях насычэння прамысловых і грамадзянскіх аб'ектаў энергіяй XX ст. І зрабіў гэта на падставе новых крыніц, прагляду і аналізу мноства наратыўнага і кагнітыўнага матэрыялу. Напрыканцы 1971 г. дысертацыя была паспяхова абаронена, а маладога кандыдата навук залічылі выкладчыкам у штат кафедры, якая яго выхавала як навукоўца. Залічылі на падставе міністэрскага пасведчання № 130, якое за подпісам намесніка міністра адукацыі зафіксавала тое, што выпускнік аспірантуры «направляется в распоряжение ректората» для работы на пасадзе асістэнта з акладам 105 руб.

Так распачалася шматгадовая плённая праца выкладчыка, а з 1978 г. – дацэнта гістарычнага факультэта БДУ Івана Апанасавіча Літвіноўскага. Плённая, бо за дзесяцігоддзі ён стаў на факультэце ўвасабленнем педагагічнай і навуковай грунтоўнасці, адначасова з тым шчырай сардэчнасці і цеплыні ў адносінах да сваіх выхаванцаў і калег. Мабыць, гэтыя чалавечыя якасці адыгралі сваю ролю, калі маладому яшчэ выкладчыку была прапанавана пасада выконваючага абавязкі загадчыка навастворанай кафедры гісторыі СССР эпохі сацыялізму. Яе вылучылі з кафедры гісторыі СССР (як і кафедру гісторыі СССР дасавецкага перыяду). Такі падзел кафедры, што дзейнічала на факультэце ажно з сярэдзіны 1930-х гг., быў абумоўлены новым вітком надання з боку ўлады асаблівай ідэалагічнай знакавасці менавіта савецкаму перыяду ў асэнсаванні і студэнтамі, і грамадствам шматвектарнай і нават не зусім зразумелай гісторыі СССР. А незразумеласць зыходзіла з таго, што гэты курс, які выкладаўся адпаведнымі кафедрамі ва ўсіх савецкіх установах вышэйшай адукацыі і амаль на ўсіх спецыяльнасцях, са сталінскіх часоў павінен быў распавядаць не толькі пра гісторыю савецкай краіны, але і пра яе перадгісторыю. А гэта значыла, што гісторыя СССР як бы распаўсюджвалася і на старажытны перыяд, і на сярэдневяковы, і на Новы час у гісторыі ўсіх 15 савецкіх рэспублік.

Таму Іван Апанасавіч быў «кінуты» на зацвярджэнне ў адукацыйным працэсе беларускага ўніверсітэта прыярытэту падрыхтоўкі спецыяльных знаўцаў выніковага этапу гістарычнага развіцця «шматнацыянальнага савецкага народа». І навуковец аказаўся на сваім месцы, бо змог не толькі распачаць такую падрыхтоўку, але і ў перыяд з 1974 па 1988 г. зрабіў кафедру адной з самых вядомых на факультэце і ва ўніверсітэце. На ёй сабраліся маладыя амбіцыёзныя кадры (згадаем хаця б імёны Л. А. Міхайлоўскага, К. І. Осіпава, Е. Ф. Саўчук, У. Н. Сідарцова, М. Э. Часноўскага, П. К. Краўчанкі, А. П. Салькова). Адны, на жаль, ужо сышлі ад нас, другія плённа працуюць, сталі дактарамі навук, загадчыкамі кафедраў. На кафедры гісторыі СССР эпохі сацыялізму былі падрыхтаваны дзясяткі аспірантаў, якія сёння ў БДУ і не толькі працягваюць даследаванні па шматлікіх праблемах такога складанага і насычанага падзеямі XX ст. Іван Апанасавіч, як кіраўнік кафедры, стаў тым чалавекам, што даў ім пуцёўку ў вялікую навуку.

Потым, з канца 1980-х гг., пачаўся новы этап у лёсе І. А. Літвіноўскага. На хвалях перабудовы і пачатку гісторыі незалежнай Беларусі ён, як і ўсе яго калегі-гісторыкі БДУ, прайшоў складаны шлях асэнсавання свайго прызначэння – выкладчыка вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь. Адбываўся пошук новых навуковых парадыгм, арганізацыйных форм вучэбнага працэсу. Лагічным падсумаваннем пературбацый 1990-х гг. стала стварэнне ў чэрвені 1998 г. кафедры гісторыі Расіі з выкладаннем на ёй сістэмнага курсу «гісторыя Расіі і Украіны» – бліжэйшых краін-суседак, так шчыльна знітаваных агульнымі гістарычнымі повязямі з Беларуссю. Іван Апанасавіч увайшоў у першы кадравы склад новай кафедры і стаў выкладаць важныя лекцыйныя курсы міжваеннай гісторыі ўсходнеславянскіх краін, акцэнтуючы ўвагу менавіта на гісторыі сваёй малой радзімы – Украіны. Дацэнт Літвіноўскі засяродзіўся на распрацоўцы вучэбных матэрыялаў па ўкраінскай гісторыі, стаў адным з аўтараў шэрагу першых беларускіх універсітэцкіх дапаможнікаў па гісторыі Расіі і Украіны.

Вакол Івана Апанасавіча на кафедры, у аўдыторыях і калідорах факультэта заўсёды шмат студэнтаў. Ціхі прыглушаны барытон дацэнта чутны пастаянна, бо моладзь цягнецца да свайго выкладчыка, здольнага даць каштоўныя парады, адкрыць таямніцы гісторыі Другой сусветнай вайны, знешняй палітыкі СССР (у гэтых пытаннях ён, бадай, самы аўтарытэтны на гістарычным факультэце спецыяліст). Да таго ж расіязнаўца ў апошнія гады выступае як энтузіяст-арганізатар ужо некалькіх студэнцкіх канферэнцый «Кітай: гісторыя і сучаснасць», якія праводзяцца БДУ сумесна з Інстытутам Канфуцыя ў рамках Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Кітайская цывілізацыя ў дыялогу культур». У многім дзякуючы крэатыўнасці І. А. Літвіноўскага канферэнцыі не толькі набылі маштабнасць, але і прыцягнулі да паглыбленага вывучэння гісторыі далёкай краіны дзясяткі студэнтаў. А для папулярызацыі сярод моладзі сваіх асабістых навуковых пошукаў па праблемах гісторыі энергетыкі Іван Апанасавіч нядаўна стаў завадатарам студэнцкай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Атам на службе чалавека: учора, сёння,

заўтра». Навуковец запатрабаваны на тэлебачанні, радыё, дзе асаблівую цікавасць выклікаюць яго расповеды пра абставіны падзей Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Выключнай рысай выкладчыка і навукоўца з'яўляецца яго добрасумленнасць, адданасць справе жыцця, памножаныя на відавочную любоў і павагу да сваіх вучняў. А яны, вучні, штораз вяртаюць настаўніку сваю ўдзячнасць не толькі за набытыя веды, але і за прыклад таго, якім павінен быць педагог.

Больш за тое, усе без выключэння калегі Івана Апанасавіча – а многія з іх лічаць яго сваім настаўнікам – не менш за студэнтаў удзячныя яму за відавочныя прыклады вернасці музе Кліа і чалавечай шчырасці, шчодрасці, сумленнасці ва ўсім. Калектыў гістарычнага факультэта, калегі па кафедры гісторыі Расіі зычаць юбіляру моцнага здароўя, працягу плённага спазнання таямніц мінулага!

*А. А. Яноўскі,*
кандыдат гістарычных навук, прафесар

# Міхаіл Фёдаравіч ШУМЕЙКА

# Mihail Fiodaravich SHUMEIKA



Споўнілася 65 гадоў кандыдату гістарычных навук, дацэнту, дацэнту кафедры крыніцазнаўства БДУ Міхаілу Фёдаравічу Шумейку.

Нарадзіўся М. Ф. Шумейка 20 жніўня 1952 г. у в. Верхняя Злобінка Почапскага раёна Бранскай вобласці (Расія). Па заканчэнні сярэдняй школы ў 1969 г. паступіў на факультэт архіўнай справы Маскоўскага дзяржаўнага гісторыка-архіўнага інстытута (МДГАІ). Міхаіл Фёдаравіч Шумейка – вучань выдатнага навукоўца Сігурда Отавіча Шміта, знаёмства з якім не толькі шмат у чым прадвызначыла навуковы шлях юбіляра, але і стала для яго каштоўным асабістым здабыткам. Пасля паспяховага заканчэння адной з найлепшых устаноў вышэйшай адукацыі Савецкага Саюза ў 1974 г. малады гісторык-архівіст вярнуўся на Браншчыну, дзе непрацяглы час працаваў старшым навуковым супрацоўнікам Дзяржаўнага архіва Бранскай вобласці. У 1974–1975 гг. служыў у Савецкай арміі. У 1976 г. заняў пасаду старшага навуковага супрацоўніка Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі БССР, а ў 1977 г. – супрацоўніка Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР.

З 1977 г. навучаўся ў аспірантуры МДГАІ па спецыяльнасці «Крыніцазнаўства, гістарыяграфія, метады гістарычнага даследавання». У 1980 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Из истории выявления и собирания документов революционного движения в России второй половины XIX – начала XX в. (по материалам архива В. Я. Богучарского)».

У 1977–1991 гг. Міхаіл Фёдаравіч працаваў у Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ (з кастрычніка 1990 г. – Інстытут гісторыка-палітычных даследаванняў КПБ). Калі ў 1991 г. на базе гэтай установы быў створаны Беларускі навукова-даследчы цэнтр дакументазнаўства і рэтраінфармацыі (сёння – Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы (БелНДІДАС)),